
КРЫНІЦА ВЕДАЎ

Абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна — 50 год



Нараджэнне абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна адносіцца да кастрычніка 1925 года, калі па рашэнню акругавага выканаўчага камітэта ў Віцебску была пачата арганізацыя Віцебскага аддзялення (філіяла) дзяржаўнай рэспубліканскай бібліятэкі. Асновай фарміравання яе кніжных фондаў з'явіліся фонды аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, інстытута народнай асветы, а таксама кніжныя запасы, сабраныя пры Віцебскім аддзяленні дзяржаўнага музея.

У сувязі з увядзеннем у рэспубліцы абласнога дзялення ў 1938 годзе бібліятэка была рэарганізавана ў абласную. У гэтым жа годзе ёй было прысвоена імя У. І. Леніна.

Да 1941 года кніжны фонд бібліятэкі налічваў ужо больш за 100 тысяч экземпляраў. Гэты унікальны, па тым часе, збор кніг у перыяд акупацыі быў бязлітасна разграблен або знішчан нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1944 годзе, пасля вызвалення Віцебска, бібліятэка перажыла сваё другое нараджэнне. У аднаўленні яе кніжных фондаў вялікую ролю адыграў Дзяржфонд літаратуры, створаны па рашэнню Саўнаркома СССР у пачатку 1943 года.

За 1944 — 1945 гады з Дзяржфонду літаратуры была атрымана вялікая колькасць кніг. Ужо к канцу 1946 года ў бібліятэцы налічвалася больш за 50 тысяч экземпляраў.

Цяпер абласная бібліятэка імя У. І. Леніна буйная ідэалагічная і навукова-інфармацыйная бібліятэцы ў сістэме навуковай і тэхнічнай інфармацыі. Гэтай мэце служыць не толькі кніжны фонд бібліятэкі, але і спецыяльныя віды выданняў: ГОСТы, ОСТы, нормы, тэхнічныя ўмовы, прамысловыя каталогі. Бібліятэка мае таксама шмат інфармацыйна-бібліяграфічных выданняў практычна па ўсіх пытаннях навукі і культуры.

Штоквартальна бібліятэка выдае бюлетэнь «Новыя паступленні літаратуры ў абласную бібліятэку» па грамадска-палітычных пытаннях, сельскагаспадарчай і тэхнічнай літаратуры. Ён рассылаецца ў абласныя і раённыя арганізацыі па свайму профілю.

Айчыннай вайны (1941 — 1945 г. г.)», «Выдатныя ўраджэнцы і дзеячы Віцебскай вобласці», «Залатыя зоркі Віцебшчыны» (аб героях Сацыялістычнай Працы). Аддзел штоквартальна выдае «Інфармацыйныя лісты новых паступленняў літаратуры аб Віцебскай вобласці», якія рассылаюцца ў абласныя і раённыя арганізацыі. Арганізуюцца краязнаўчыя чытанні. Сярод іх вялікай папулярнасцю ў чытачоў карыстаюцца канферэнцыі чытачоў па кнігах пісьменнікаў — ураджэнцаў вобласці, аб Віцебску і Віцебшчыне.

Цэнтрам нашай бібліятэкі па праву з'яўляецца яе даведачна-бібліяграфічны аддзел. Высокакваліфікаваныя бібліёграфы на працягу кароткага часу могуць задаволіць запытанне чытача на любую бібліяграфічную і фактычную даведку. Штогод аддзел выдае больш за 8 тысяч бібліяграфічных і фактычных даведак.

Для гэтай мэты бібліятэка мае разнастайны даведачны апарат. Нашы кніжныя багацці раскрыты ў сістэме каталогаў і картак. Да паслуг чытачоў розныя даведачныя выданні, агульныя і галіновыя энцыклапедыі, даведнікі, галіновыя і моўныя слоўнікі і іншае.

За гады Савецкай улады ў вобласці створана разгалінаваная бібліятэчная сетка, здольная поўнасцю задаволіць разнастайныя запытанні чытачоў. Асабліва інтэнсіўна развівалася яна ў перыяд, калі выйшлі пастановы ЦК КПСС «Аб стане і мерах паляпшэння бібліятэчнай справы ў краіне» (1959 г.) і «Аб павышэнні ролі бібліятэк у камуністычным выхаванні працоўных у навукова-тэхнічным прагрэсе» (1974 г.). За гэты перыяд сетка бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры БССР практычна падвоілася, кнігазабяспечанасць насельніцтва павялічылася ў 3,6 раза, колькасць чытачоў у бібліятэках узрасла ў 2,4 раза. Цяпер у вобласці толькі 1104 бібліятэкі сістэмы Міністэрства куль-



У аддзеле камплектавання і апрацоўкі паступаючай літаратуры.

ная установа.

У 1966 годзе быў узведзен новы тыпавы будынак бібліятэкі. Гэта дазволіла стварыць спрыяльныя ўмовы для размяшчэння фондаў і работы з чытачамі.

Аб цяперашняй дзейнасці нашай бібліятэкі можна меркаваць, у прыватнасці, па яе кніжных багаццях. Калі ў дзень адкрыцця яна магла прапанаваць чытачам толькі адносна невялікі збор кніг, то цяпер іх 487 тысяч. Фонды бібліятэкі разлічаны як на навуковых работнікаў і спецыялістаў, так і на масавых чытачоў. Штогод яны папаўняюцца больш як на 30 тысяч экземпляраў. Бібліятэка атрымлівае платны абавязковы экземпляр выданняў, якія выходзяць як у БССР, так і ва ўсёй краіне.

Шмат клопатаў праяўляюць работнікі бібліятэкі аб якасці абслугоўвання чытачоў. Дыферэнцыраванае абслугоўванне ажыццяўляецца праз спецыялізаваныя аддзелы: тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, беларускай і краязнаўчай літаратуры, мастацтваў, замежнай літаратуры, групавое — на абанеменце, галіновае — у чытальнай зале. Гэта стварае ўмовы для пастаяннага росту колькасці чытачоў. Калі ў 1946 годзе бібліятэка абслугоўвала 4,5 тысячы чытачоў, то летась іх было больш за 26 тысяч.

У сценах бібліятэкі нарадзілася не адна кандыдацкая дысертацыя. Наша бібліятэка дапамагла многім сотням чытачоў завочна скончыць ВНУ, тэхнікумы, вячэрнія школы.


Расце выдача літаратуры. У 1974 годзе яна склала больш паўмільёна экземпляраў. Аб інтарэсах нашых чытачоў сведчыць той факт, што з агульнай кнігавыдачы 75 працэнтаў складае выдача грамадска-палітычнай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай і іншай літаратуры.

Пастаянны рост выдачы галіновай літаратуры — сведчанне шматгранных інтарэсаў нашых чытачоў. Цяпер гэта людзі дапытлівай думкі, якія імкнуцца авалодаць скарбніцамі навукі і культуры.

Выдача літаратуры расце не толькі працоўным Віцебска, але і вобласці. Сотні жыхароў Прыдзвіння з дапамогай міжбібліятэчнага абанемента сталі чытачамі нашай бібліятэкі. Сярод іх спецыялісты сельскай гаспадаркі, партыйныя і савецкія актывісты, сельская інтэлігенцыя.

Асобую ўвагу бібліятэка ўдзяляе папулярызацыі твораў класікаў марксізму-ленінізму, Праграмы КПСС, рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XXVII з'езда КПБ. Не абмяжоўваючыся рэкамендацыяй кніг на абанеменце, работнікі бібліятэкі выкарыстоўваюць розныя формы нагляднай і вуснай прапаганды — кніжныя выстаўкі, падборкі літаратуры, бібліяграфічныя агляды.

Вялікая роля належыць бібліятэкам у правядзенні дзён інфармацыі.



Агульная чытальная зала. Фота М. Сівакова.

Дні інфармацыі, тэматычныя прагляды літаратуры, дні спецыялістаў, індывідуальная інфармацыя і іншыя формы работы, якія доўгі час былі прэрагатывай спецыяльных бібліятэк, увайшлі сёння ў арсенал форм і метадаў абслугоўвання чытачоў нашай бібліятэкі. Толькі за апошні час бібліятэкай разам з Віцебскім аддзяленнем інстытута навуковай і тэхнічнай інфармацыі Дзяржплана БССР былі праведзены дні інфармацыі на тэмы: «Стандарты і якасць», «НАП — важнейшы фактар павышэння прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці», «Ахова працы і тэхніка бяспекі ў прамысловасці».

У апошні час прыкметна ўзмацнілася жаданне нашых чытачоў далучыцца да мастацтва. У 1966 годзе пры бібліятэцы быў адкрыт спецыялізаваны аддзел мастацтваў. У фондзе аддзела—кнігі, часопісы, нотныя выданні, а таксама 3000 дыскаў гуказапісу. Тут заўсёды ветліва сустрэнуць чытачоў, а іх 1200 — выкладчыкаў мастацтвазнаўчых дысцыплін, кіраўнікоў і ўдзельнікаў гурткоў мастацкай самадзейнасці, усіх, хто жадае далучыцца да цудоўнага.

Гордасцю бібліятэкі з'яўляецца разгорнутая сістэма абслугоўвання чытачоў літаратурай аб родным краі. Гэтаму садзейнічае спецыялізаваны аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры са сваім фондам (9,5 тысячы экземпляраў), каталогамі, картатэкамі, чытальнай залай і абанементам. У аддзеле прадстаўлены кнігі, часопісы, газеты, брашуры і іншыя выданні, якія характарызуюць гісторыю, прыроду, эканоміку і культуру Беларусі і нашай вобласці.

Нашы краязнаўцы займаюцца сур'ёзнымі даследаваннямі. За апошні час яны склалі бібліяграфічныя ўказальнікі «Партызанскі рух і патрыятычнае падполле Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Віцебск», «Віцебская вобласць» і іншыя.

Шмат гадоў бібліятэка з'яўляецца дэпазітарыем выданняў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР. Іх кніжны фонд складае 12 мільёнаў экземпляраў.

У станаўленні і развіцці бібліятэчнай справы ў вобласці вялікая роля належыць абласной бібліятэцы. Яе метадычны аддзел сістэматычна складае і рассылае кансультацыі, метадычныя дапаможнікі, праводзіць метадычныя нарады, навукова-практычныя канферэнцыі, разам з упраўленнем культуры аблвыканкома арганізуе мерапрыемствы па павышэнню кваліфікацыі бібліятэкараў вобласці.

Калектыў нашай бібліятэкі імкнецца да таго, каб своечасова трапіла да чытача кніга, дапамагла яму ў працы, вучобе, адпачынку. З году ў год ён папаўняецца кваліфікаванымі спецыялістамі — выпускнікамі бібліятэчнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Наша бібліятэка ў сваю чаргу з'яўляецца базай практыкі студэнтаў бібліятэчнага факультэта гэтага інстытута. Шмат сіл і стараннаў уклалі ў развіццё бібліятэчнай справы ветэраны, многія з якіх працуюць тут больш чым па 25 год. Гэта намеснік дырэктара па навуковай частцы В. Я. Ноткіна, загадчыца абанемента М. С. Шайкевіч, загадчыца аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры Л. Ц. Бяззубік, загадчыца агульнай чытальнай залы В. Ф. Рэпнікава, загадчыца аддзела камплектавання і апрацоўкі В. П. Астрэйка, галоўны бібліёграф Л. Р. Янчанка, старшы бібліёграф Л. А. Перлава.

Наш калектыў і надалей будзе павышаць ролю бібліятэкі ў высакароднай справе выхавання адданых Радзіме, актыўных, свядомых, усебакова развітых будаўнікоў камуністычнага грамадства.

У. ВАНЦЕЕЎ,
дырэктар абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.
А. ІВАНОЎ,
загадчык навукова-метадычнага аддзела.